УДК 821.161.3.09

*Алейнік Лада Віктараўна*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

# САЦЫЯЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНЫ ПАРТРЭТ СУЧАСНІКА Ў АПОВЕСЦІ А. КАЗЛОВА «ПАРАЗУМЕЦЦА З ВЕТРАМ»

**Анатацыя.** *Аналізуецца аповесць А. Казлова «Паразумецца з ветрам» (2014). Даследуюцца сацыяльныя і псіхалагічныя якасці літаратурнага героя найноўшага часу, якому даводзіцца дзейнічаць ва ўмовах радыкальных сацыяльных трансфармацый, імклівага пашырэння прасторы віртуальнай жыццядзейнасці, кардынальных зменаў грамадскіх норм і каштоўнасцей. Вызначаюцца прычынна-выніковыя сувязі ўнутранага канфлікту героя мастацкага твора.*

**Ключавыя словы:** *сучасная проза, літаратурны герой, сацыяльна-псіхалагічны партрэт, транзітыўнае грамадства, этыка, сацыялізацыя.*

**Abstract.** *Analyzing A. Kozlov's short story «An Agreement with the Wind» (2014). The social and psychological qualities of the literary hero of modern times, who has to act in the conditions of radical social transformations, rapid expansion of the space of virtual life activities, radical changes of social norms and values, are studied. The cause-and-effect relationships of the internal conflict of the hero of the work of art are determined.*

**Keywords:** *modern prose, literary hero, socio-psychological portrait, transitive society, ethics, socialization.*

Сацыяльна-псіхалагічны партрэт літаратурнага персанажа перадусім мае на ўвазе адлюстраванне асабістых якасцей мастацкага героя – характару, тэмпераменту, эмацыянальнай сферы, інтэлектуальнага ўзроўню, але гэтаксама здольнасцей да сацыяльнага камунікавання, уменняў і навыкаў грамадскага ўзаемадзеяння. Інакш кажучы, аўтар літаратурнага твора выяўляе не толькі індывідуальнасць персанажа, але няўхільна разглядае яго як сацыяльную асобу, таму вобраз мастацкага героя ў пэўнай ступені адлюстроўвае тэндэнцыі канкрэтнай гістарычнай эпохі, тыповыя рысы часу.

У беларускай літаратуры XX ст. увасоблена даволі шырокая галерэя сацыяльна-псіхалагічных партрэтаў літаратурных герояў. Аднак гістарычныя і сацыяльна-палітычныя ўмовы развіцця айчыннага прыгожага пісьменства ў мінулым стагоддзі амаль заўсёды ўсталёўвалі пэўныя рамкі літаратурнай творчасці.

Так, напрыклад, панаванне метаду сацыялістычнага рэалізму вымагала ад мастакоў слова стварэння ідэалізаванага вобраза савецкага чалавека, высокамаральнага і дабрадзейнага героя. Вынікам ідэалагічнага ціску стала ігнараванне пісьменнікамі антаганістычных супярэчнасцей грамадскага жыцця, з'яўленне вялікай колькасці ілюстрацыйных і схематычных твораў, героі якіх увасаблялі вобраз бездакорнага чалавека, былі ўзорамі для пераймання. Варта заўважыць, што асобныя галасы літаратараў, якія больш разважліва ацэньвалі сітуацыю ў культуры і мастацтве, гучалі ўжо ў 1930 гады: «Ідэалагічнай крыніцай стандартызацыі нашых літаратурных герояў з'яўляецца спрошчанае ўяўленне пра нашага савецкага чалавека… <…> Гэтага самага нашага героя вызвалілі ад усіх канфліктаў і цешацца: якая шчаслівая бесканфліктная істота! Наш герой даўно адвык разважаць, пакутліва вырашаць, трываць нязручнасці… Гэта нейкая спрошчаная істота, у якой усё вырашана, якой усё вядома і невядомы толькі грэх…» [1, с. 161]. Аднак дзяржаўныя пастулаты, якімі рэгулявалася мастацкая творчасць, не падлягалі ігнараванню і на дзесяцігоддзі зрабіліся неабходнай умовай пісьменніцкай дзейнасці.

Усталяваная ў сярэдзіне XX ст. «тэорыя бесканфліктнасці» запатрабавала ад пісьменнікаў паказу не столькі індывідуалізаванай асобы, колькі чалавека, уключанага ў грамадства, актыўнага ўдзельніка сацыяльна-калектыўнага жыцця краіны, які парадным крокам маршыруе «ад перамогі да перамогі». У праграмным артыкуле «Будні ці святы?» крытык А. Эльяшэвіч сцвярджаў: «Нам патрэбна святочная літаратура, не літаратура пра "святы", а менавіта святочная літаратура, якая ўздымае чалавека над дробязямі і выпадковасцямі…» [2, с. 184].

Радыкальныя змены, якія адбыліся ў сацыяльна-палітычным жыцці краіны ў сярэдзіне 1980 – пачатку 1990 гадоў – перабудова, дэмакратызацыя, галоснасць, знікненне ідэалагічных перашкодаў дазволілі пісьменнікам пашырыць праблемна-тэматычнае кола творчасці. Прыкладам – шматлікія творы не толькі сталых аўтараў, але і пісьменнікаў новай генерацыі – А. Асташонка, А. Федарэнкі, А. Наварыча, А. Глобуса, А. Казлова, У. Сцяпана і інш. Героі прозы гэтага часу, у адрозненне ад сваіх міфалагізаваных папярэднікаў – носьбітаў выключна станоўчых якасцей, зрабіліся значна больш рэалістычнымі, неадназначнымі і супярэчлівымі. Іх адметнасць менавіта ў «звычайнасці» – гэта зусім не гераічныя персанажы, гэта шараговыя людзі са сваімі недахопамі, слабасцямі і праблемамі. Увасабленне разнастайных герояў з натуральнымі якасцямі характару і зразумелымі эмоцыямі садзейнічае інклюзіўнасці літаратуры, дазваляе чытачам знайсці ў мастацкіх творах уласныя праблемы і сітуацыі, асэнсаваць іх разам з персанажамі. Мастацкая літаратура пачынае выконваць функцыю ўжо не столькі ідэалагічнага выхавання чытача, колькі яго сацыялізацыі.

Пачатак XXI ст. вызначыўся ў свеце маштабнымі сацыякультурнымі і геапалітычнымі трансфармацыямі. Сучасная эпоха характарызуецца сацыяльнайтранзітыўнасцю, зменай грамадскіх стэрэатыпаў, норм, каштоўнасцей і эталонаў. Сітуацыя нестабільнасці зрабілася прычынай трывожнага светаадчування сучасніка, няўпэўненасці ў сваіх дзеяннях, у будучыні. Імклівае развіццё інфармацыйных тэхналогій садзейнічае бесперапыннаму пашырэнню віртуальнага поля жыццядзейнасці, што відавочна ўзмацняе сацыяльную раз’яднанасць, стымулюе да ізаляванасці, да замкнёнанасці ў асабістай прасторы. «Паколькі надзвычай важнае значэнне ў транзітыўным грамадстве мае сінтэз агульначалавечых каштоўнасцей і каштоўнасцей мадэрнізаванага грамадства, то найбольш прадуктыўным уяўляецца асэнсаванне працэсаў гэтага сінтэза праз жыццёвы свет індывіда і камунікацыю як механізм сінтэзавання вызначаных каштоўнасцей» [3, с. 30]. Мастацкая літаратура, якая вобразна аналізуе рэальнасць і выяўляе найбольш тыповае, характэрнае для асобы і грамадства, набывае ў гэтых умовах відавочную сацыяльную актуальнасць. Узоры прозы А. Казлова з’яўляюцца вельмі падставовымі тэкстамі дзеля асэнсавання асобных прычын унутранага дыскамфорту і спецыфічнай душэўнай няўтульнасці, уласцівых сучасніку, дазваляюць вызначыць этычныя арыенціры на шляху светапазнання.

Творчасць А. Казлова прыкметна вылучаецца ў рэчышчы сучаснай беларускай прозы – мастацкія ўзоры аўтара правамерна разглядаць у сістэме каардынат метаду магічнага рэалізму, які перадусім мае на ўвазе ўключэнне містычных і фантастычных элементаў у рэалістычную карціну свету. У гэтых творах, як правіла, скажаецца плынь часу, мінулае кантрастуе з сучаснасцю, падзеі разглядаюцца з альтэрнатыўных пазіцый. Адметнасць мастацкага почырку А. Казлова зрабілася відавочнай фактычна з першых літаратурных крокаў – апавяданні, якія склалі дэбютную кнігу пісьменніка «Міражы ценяў» (1990), выявілі імкненне мастака да ўвасаблення ў сюжэтах элементаў нацыянальнага фальклору, да інтэрпрэтацыі старажытных вераванняў, легенд, паданняў, звычаяў і абарадаў. Кожная з наступных кніг пісьменніка – «І тады я памёр…» (1993), «Незламаная свечка» (2000), «Юргон» (2006), «Горад у нябёсах» (2009) – пацвярджала, што спалучэнне рэальнасці з містычна-чарадзейнымі элементамі язычніцкай міфалогіі з’яўляецца ўстойлівай прыкметай мастацкага стылю аўтара, вызначальнай характарыстыкай яго творчай індывідуальнасці. Аднак аповесці пазнейшага часу, якія ўвайшлі ў кнігу А. Казлова «Той, хто абганяе сны» (2014), істотна адрозніваюцца ад папярэдніх твораў аўтара. Калі раней героі пісьменніка шукалі адказы на актуальныя пытанні быцця ў мінуўшчыне, абапіраліся на этычны вопыт, увасоблены ў нацыянальнай фальклорнай спадчыне, то ў новых творах яны шукаюць гэтыя адказы ў саміх сабе, пільна аналізуюць свае дзеянні і ўчынкі, апелююць да ўласнага сумлення.

Так, напрыклад, аповесць «Паразумецца з ветрам» пачынаецца з літаральнага дыялогу героя са сваім сэрцам. Гэты дыялог дароўніваецца да споведзі, утрымлівае рэфлексіі пра невыносную адзіноту, спустошанасць, расчараванне ва ўсім і ўсіх. «Цішыня. Душэўная пустэча. Ніводзін кішэнны кітайскі ліхтарык са Ждановіцкага рынку няздатны парушыць цямрэчу ў маёй душы. Там беспрасвецце, цяжкая і тугая ноч, хоць стальным сцізорыкам рэж, а драпіны ці баразёнкі не пакінеш… <…> Не хвалюйся, маё зраненае і здратаванае сэрца. Перажывём і гэта. <…> Мая пустэльня непадуладная часу. Ува што ці ў каго верыць? У людзей? Пэўнага чалавека? Не. Я не жыву ілюзіямі» [4, с. 83 – 84]. Напрацягу гэтага дыялогу высвятляецца ўрэшце прычына роспачы Максіма – маладому чалавеку здрадзіла каханая, якую ён лічыў «Адзінай» і «Непаўторнай». Сваю балючую крыўду герой-апавядальнік экстрапалюе на ўсю рэчаіснасць – навакольны свет падаецца яму наскрозь падманлівым і цынічным, людзі – крывадушнымі і фальшывымі, жыццё – бязмэтным і бессэнсоўным.

Зачын твора, як бачна, вельмі песімістычны, нават дэпрэсіўны. Між іншым, песімістычны пафас уласцівы пераважнай большасці твораў А. Казлова. Некаторыя даследчыкі нават падкрэсліваюць, што героі пісьменніка «акружаны духоўнай цемрай, якую спараджаюць уласнымі ўчынкамі, а наперадзе іх чакае суцэльны змрок» [5, с. 91]. Аднак у аповесці «Паразумецца з ветрам» цёмныя фарбы выкарыстоўваецца мастаком не столькі для стварэння змрочнай атмасферы, колькі для выразнасці, для кантрасту з наступнымі падзеямі. Прыгнечаны стан героя неўзабаве змяняецца на кардынальна супрацьлеглы – адчай саступае месца раздражненню і злосці, абражанае самалюбства патрабуе рэваншу. Сэрца раіць не займацца самашкадаваннем, штурхае да актыўных дзеянняў. «Апамятайся, хлопец. Яшчэ крыху – і збрэндзіш, з глуздоў з'едзеш. <…> Адчуй салодкі смак яе вялікасці Помсты. Не, не безагляднай і бяздумнай, а выверанай, узважанай» [4, с. 95]. Герой вызначаецца ў далейшых дзеяннях, прымае рашэнне радыкальна змяніць сваё жыццё, самога сябе, а лепшым спосабам адпомсціць каханай лічыць узаемную здраду. Малады чалавек рэгіструецца на сайце знаёмстваў і пачынае актыўны пошук патэнцыйнай каханкі.

Ужо нават гэтыя дзеянні – крыўда на ўвесь свет, імпульсіўнае і недарэчнае рашэнне «адпомсціць» – выдаюць маральную няспеласць героя, сацыяльную інфантыльнасць. Малады мужчына не прадпрымае ніякіх спробаў перамовіцца са сваёй каханай, не разглядае ніякіх варыянтаў высветліць сітуацыю, ён засяроджаны толькі на ўласных эмоцыях, смакуе сваю крыўду і паводзіць сябе не як дарослы чалавек, а як капрызлівае дзіця. Сучасныя псіхолагі падкрэсліваюць, што адной з асноўных характарыстык інфантыльнай асобы з'яўляецца паніжаная крытычнасць

да сябе і павышаная патрабавальнасць да іншых, а таксама разнастайныя кампенсаторныя рэакцыі. «Інфантыльная асоба імкнецца пазбегнуць неабходнасці адэкватна ацэньваць аб’ектыўную рэальнасць» [6, с. 94]. Герой аповесці свядома адпрэчвае міжвольнае жаданне спакойна і ўзважана разабрацца ў сітуацыі. Унутраны голас запэўнівае, што такі мужчына, як ён – малады, дужы, разумны, прыгожы – гэта «падарунак» для любой жанчыны, няхай яго кахаюць і з-за яго перажываюць, а ён больш ніколі не дазволіць сабе гэтага пачуцця.

Знаёмствы з жанчынамі ў сеціве аказваюцца выдатным спосабам «запоўніць душэўную пустату новымі адчуваннямі». Віртуальныя перамовы не патрабуюць асаблівага напружвання, наадварот – гэта вельмі зручны спосаб камунікавання, вельмі канкрэтныя дамоўленасці пра «інтымныя адносіны без абавязкаў». Максім уражаны, з якой лёгкасцю жанчыны пагаджаюцца на сустрэчы. «У душы зараджалася пакуль незразумелая злая радасць. Радасць ад здрады, ад пазбаўлення маральных абавязкаў у вернасці. Усведамленне таго, што іншыя, незнаёмыя дзяўчаты і жанчыны таксама хочуць тваёй цеплыні, увагі…» [4, с. 112].

Аповесць А. Казлова даволі выразна ілюструе праблемы сучаснага соцыуму – нежаданне маладых людзей выпрацоўваць жыццёвую стратэгію, але абыходзіцца толькі часовымі тактыкамі, схільнасць да эскапізму, эгацэнтрызму. У псіхалагічных даследаваннях падкрэсліваецца, што ў транзітыўным грамадстве дыяпазон магчымасцей і спосабаў пражываць сваё жыццё надзвычай шырокі. Пры гэтым СМІ, разнастайныя медыярэсурсы актыўна транслююць геданістычную каштоўнасць чалавечага існавання – «жыццё кароткае, не страчвай час на перажыванні», «атрымлівай асалоду ад жыцця», «любі сябе», «жыві для сябе» і г.д. Герой твора мэтаскіравана «атрымлівае асалоду» ад шматлікіх сувязяў з жанчынамі, перапаўняецца новымі ўражаннямі, пачуццямі. «Кватэры, нумары гатэляў, сауны і душавыя кабінкі, заднія сядзенні іншамарак, прыцемненыя лавы ў скверах і парках саступалі месца недалёкім ад Мінска дачам, лясным палянам, турыстычным намётам… У галаве змяшаліся густым кактэйлем імёны дзяўчат, маладзічак і жанчын, як безасабова кажуць, сярэдніх гадкоў» [4, с. 155]. Здавалася б, жыццё пачынае наладжвацца. Але вяртаючыся ў пустую кватэру, Максім неадступна пачынае згадваць усё, што звязвала яго з колішняй каханай. Варта адзначыць, што імя гэтай гераіні ў аповесці няма, Максім называе яе толькі «Адзіная» і «Непаўторная». І ніводная з новых знаёмых, з якімі маладому чалавеку выпала сустрэцца, не дапамагла яму пазбыцца ўспамінаў пра каханую, не выратавала ад балючай адзіноты.

Герой твора бясконца перабірае ў памяці, як упершыню ўбачыў сваю Адзіную – гэта адбылося ў турыстычнай вандроўцы на грэчаскі востраў Міканас;

як завязалася іх гаворка; як цікава было размаўляць з гэтай дзяўчынай; як шмат у іх было агульных інтарэсаў і захапленняў. Максім адразу беспамылкова адчуў, што гэта – сапраўднае каханне, якое бывае ўсяго раз у жыцці. «Душу маю агарнула вясна. Усёпаглынальная, вар’яцкая, шалёная вясна сярод лета Грэцыі. На востраве Міканас я за адзін год сустрэў дзве вясны, адну за адной. Скажаце: так не бывае. І памыліцеся на ўсе сто працэнтаў. Бо, хутчэй за ўсё, вы не кахалі. Абмінуў вас Купідон сваёю стралою. А вось мяне ў тую хвіліну ён смяртэльна параніў. <…> Я ўжо ведаў, што нарэшце знайшоў свой лёс, напаткаў другую палавінку» [4, с. 138 – 139].

Жыццё з каханай жанчынай натхняла Максіма, давала пачуццё ўпэўненасці і камфорту, будучыня мела перспектывы. Без кахання ўсё знікла, само існаванне страціла сэнс. Ніякія часовыя адносіны, ніякія спосабы пазбыцца перажыванняў не здолелі запоўніць пустэчу ў душы героя. Малады чалавек апраўдвае свае дзеянні ўмовамі часу, вымлумачвае, што цынічныя і эгаістычныя паводзіны якраз адпавядаюць патрабаванням хаатычнай і няпэўнай сучаснасці. Аднак уцёкі ад рэальнасці ў віртуальны свет, лёгкія спосабы камунікавання, адмаўленне ад адказнасці за свае дзеянні не прыносяць Максіму ні шчасця, ні душэўнай раўнавагі.

Фінал твора вырашаны аўтарам у белетрыстычнай манеры: каханая жанчына знаходзіць Максіма на сайце знаёмстваў і ад чужога імя прызначае яму спатканне. «…І вось я перад кватэрай стандартнай хрушчоўкі. Палец звыкла націскае званок. Плаўна адчыняюцца жалезныя дзверы, і я бачу сваю Адзіную, сваё сонейка. Адхінаюся ўсім целам. Заклала вушы, абарвалася і пакацілася па лесвічнай пляцоўцы маё сэрца. Абяскроўленае і спакутаванае. Я плачу» [4, с. 163]. У гэты момант малады чалавек імгненна забываецца на ўсе свае крыўды, рэўнасць, жаданне «адпомсціць». Усе нядаўнія перажыванні мізарнеюць, бо ён ізноў бачыць каханую і атрымлівае надзею на шчасце.

У аповесці «Паразумецца з ветрам» даволі выразна выяўляецца, што радыкальныя сацыяльныя трансфармацыі, няпэўнасць і супярэчлівасць грамадскіх эталонаў эпохі транзітыўнасці не змяняюць асноўнай сутнасці чалавечай прыроды. Тэхналагізацыя жыцця, ананімізацыя і спакуслівая лёгкасць асабістых адносінаў нярэдка ўводзяць у зман, дэвальвуюць сапраўдныя каштоўнасці. Пры ўсіх глабальных зрухах у сістэме светаўладкавання, у структуры пэўнага грамадства для асобы па-ранейшаму вызначальнымі з’яўляюцца вельмі простыя рэчы – каханне, сяброўства, давер, паразуменне, павага. Гэта базавыя каштоўнасці, якія з’яўляюцца сэнсаўтваральнымі для чалавечага існавання.

Герой аповесці А. Казлова адлюстроўвае пэўныя змены, якія адбываюцца ў свядомасці сучаснікаў, выразна падкрэслівае важнасць супрацьстаяння не толькі

глабальным, але і паўсядзённым выклікам часу. Гэты вобраз па-свойму нагадвае, што менавіта чалавек кіруе абставінамі, але не наадварот. Сюжэт твора адлюстроўвае сітуацыю, здольную зрабіцца арыенцірам у працэсе сацыялізацыі чытача, пераасэнсаваць асабістыя каштоўнасці і этычныя прынцыпы.

ЛІТАРАТУРА


1. Макаренко, А. С. Против шаблона / А. С. Макаренко // Педагогические сочинения: в 8 т. Т. 7. – М. : Педагогика, 1986. – С. 160 – 164.
2. Эльяшевич, А. Будни или праздники? / А. Эльяшевич // Звезда. – 1954. – № 10. – С. 175–184.
3. Федотова, М. Г. К содержанию понятия «транзитивное общество» / М. Г. Федотова // Вестник Вятского государственного университета. – 2010. – № 4. – С. 28 – 31.
4. Казлоў, А. Паразумецца з ветрам / А. Казлоў // Той, хто абганяе сны: аповесці. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. – С. 81 – 164.
5. Конеў, Я. Асноўны інстынкт / Я. Конеў // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 91 – 92.
6. Сабельникова, Е. В., Хмелева, Н. Л. Инфантилизм: теоретический конструкт и операционализация / Е. В. Сабельникова, Н. Л. Хмелева // Образование и наука. – 2016. – № 3. – С. 89 – 105.